*А.Л.Хмелянок*

# КОЛЕР У БЕЛАРУСКІМ І ІНДЫЙСКІМ ТРАДЫЦЫЙНЫМ АДЗЕННІ

Традыцыйнае адзенне з'яўляецца важным этнічным і сацыяльным паказчыкам. Яно адлюстроўвае утылітарна-практычныя запатрабаванні, мастацкія ўяўленні, звычаі і вераванні народа. Пры засяленні тэрыторыі цяперашняй Беларусі славянамі захавалася дахрысціянская рэлігія беларусаў з рэлігійным пантэонам арыйскага паходжання. Пасля прыняцця хрысціянства ў старажытнай беларускай культуры засталіся шматлікія праявы старажытнаарыйскай культуры і рэлігіі, вытокам якіх з'яўляюцца веды, ведычная літаратура і ведычная рэлігія. Найбольшае адлюстраванне ведычныя традыцыі атрымалі ў традыцыйным адзенні, што захавалася да нашага часу ў Індыі і ў беларускіх вышыўках.

Неабходна адзначыць, што адзенне займае асаблівае месца сярод побытавых рэчаў. Яно суправаджае чалавека на кожным этапе яго жыцця.

Традыцыйнае адзенне ў даволі канцэнтраванай форме захоўвае культурную традыцыю і ў той жа час дае магчымасць кожнай майстрысе выявіць індывідуальныя творчыя, мастацкія здольнасці, свой густ у супастаўленні з традыцыяй, а значыць, з прыродай, а магчыма, і з вечнасцю.

Колер у адзенні з'яўляецца самым актыўным элементам. Найбольш распаўсюджана спалучэнне белага, чырвонага і чорнага колераў. На думку шматлікіх філосафаў (асабліва псіхааналітычнай і структурна-функцыянальнай традыцый), вытокі колеру адносяцца да часу ўтварэння космасу з хаосу, бо гэтыя колеры мелі галоўныя жыццёвыя стыхіі. Першая стыхія, якая ляжыць у вытоках усіх з'яў, – святло і цяпло – перадаецца чырвоным колерам; другая, якая дае жыццё, – вада (яна прадстаўлена белым колерам), трэцяя – зямля (прадстаўлена чорным колерам). Такое разуменне афарбоўкі жыццёвых стыхій тлумачыць выкарыстанне ў першабытным жывапісе чырвонай, чорнай і белай фарбаў. Наглядаючы за прыроднымі стыхіямі, нашы продкі імкнуліся ўвасобіць іх у побытавых рэчах, што знайшло адлюстраванне і ў адзенні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Магчыма, па гэтай прычыне вучоныя сёння параўноўваюць рытмы ўзораў на адзенні з рытмамі мелодый і песень. Таму, вывучаючы сімволіку колеру ў культуры, можна ў пэўным сэнсе прачытаць старажытныя легенды і паданні.

Значнае месца ў беларускім адзенні займае белы колер. Варта адзначыць, што ў архаічным мысленні белы колер успрымаўся не толькі як сімвал зямнога дзённага святла, малака, семені, чысціні і святасці, але і як сімвал пазачасавага незямнога святла, з якога ўсё пачынаецца і якім усё, магчыма, заканчваецца пасля смерці. Такое разуменне белага колеру прадстаўлена ў традыцыйным беларускім адзенні, яно мела пераважна белы фон: белыя рукавы кашулі, белая намітка, хустка, фартух. Аднак цалкам белае адзенне сустракалася даволі рэдка, звычайна яно ўпрыгожвалася каляровай вышыўкай ці вытканым арнаментам. Часам сустракаецца ўпрыгожванне адзення белай вышыўкай, калі таго патрабавалі мясцовыя традыцыі. Ужыванне вышывак белага колеру характэрна для асобных груп усходнеславянскіх народаў, часам яно сустракаецца ў індыйскім адзенні паўночных штатаў. Так, адзенне ў Кашміры часта аздаблялася багатай белай вышыўкай, якая рабілася пераважна на чорным ці карычневым фоне, што ўказвае на ўплыў ісламскай культуры.

Аднак вышыўка белымі ніткамі, белы колер адзення здаўна ва ўсходнеславянскіх і індыйскіх народаў звязаны з жалобным, пахавальным абрадам. Выкарыстанне белага колеру ў пахавальных абрадах звязана з тым, што белы колер – гэта колер пасляжыццёвага, незямнога святла, сімвал краіны продкаў, дзе жывуць душы памерлых. Пахавальнае адзенне на тэрыторыі Беларусі аздаблялася вышыўкай, у якой выкарыстоўваліся пераважна чорны і сіні колеры. Кожная бабулька (што можна было ўбачыць яшчэ ў пачатку XX ст.) старанна рыхтавала адзенне на смерць, імкнулася адправіцца да продкаў у "сваёй кашулі, каб дзяды пазналі". У адрозненне ад беларускай традыцыі індыйская культура ў пахавальнай абраднасці выкарыстоўвала толькі чыста белае адзенне, якое нічым не ўпрыгожвалася.

Аднак даволі часта белае сары з чырвонай ці сіняй паляй (канва па краях, якая аздаблялася пераважна вышываным ар-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

наментам) і анчалам (край сары, які звісаў з пляча на спіну ці пакрываў галаву) насілі незамужнія жанчыны, што было сімвалам чысціні і духоўнага багацця. Гэта захавалася і да нашых дзён, хаця часам такая традыцыя парушаецца.

Увогуле ў адзенні толькі белы колер сустракаўся нячаста ў адрозненне ад ансамбля белага з чырвоным. Чырвоны колер нашымі продкамі ўспрымаўся як сімвал агню, сонца, чалавечай крыві. Такім чынам, эфект напружанага ўзаемадзеяння белага і чырвонага колераў здольны перадаць рытмічнае пульсаванне самой прыроды. Выкарыстанне чырвоных нітак у аздабленні беларускага адзення, мяркуючы па літаратурных даных, тлумачыцца:

1) ужываннем у якасці апатрапею: “чырвонае трэба, каб жыццё было крапчэй”, “чырвонае чалавеку здаравей”;

2) пераемнасцю традыцый пакаленняў: “чырвоныя ўзоры – старое панашэнне”, “чырвонае кругом заведзена”, “чырвонае –старынушка”;

3) адпаведнасцю эстэтычных уяўленняў, якія прад’яўляюцца да дэкору народных тканін: “чырвонае – красата, а чорнае – жалоба”;

4) адсутнасцю ў продажы нітак іншых колераў і якасцю афарбоўкі тых, якія ёсць: “чырвоныя ніткі лягчэй прыдбаць”.

У беларускай культуры чырвоныя ніткі выкарыстоўваліся і для аховы здароўя, перасцярогі ад усяго негатыўнага. Шырока ўжываўся рознага роду чырвоны тэкстыль і ў вясельных, радзінных, пахавальных падзеях. Увогуле чырвоны колер здаўна атаясамліваўся з такімі важнейшымі для чалавека паняццямі, як кроў, жыццё, магчыма, ён асацыіраваўся і з полымем, якое неабходна для жыццядзейнасці чалавека. Можна меркаваць, што чырвоны колер, стаўшы сімвалам жыцця, і ў далейшым выконвае канкрэтную функцыю аховы здароўя і жыцця. Адсюль вялікае значэнне тэкстылю чырвонага колеру ў народнай медыцыне, замовах, заклінаннях. З’яўляючыся адным з важнейшых абярэгаў у многіх народаў, ён выкарыстоўваўся ў якасці своеасаблівай аховы не толькі жывых, але і памерлых людзей. Так, у пахавальным абрадзе сету – этнаграфічнай групы эстонскага этнасу – семантыка шарсцяных чырвоных нітак, пакладзеных на падушку крыжнакрыж, тлумачыцца як “ахова ад нячыстага”. А ў пахаваль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ным абрадзе індыйскага народа гірлянда з чырвоных кветак, якая надзявалася на шыю памерлага чалавека, лічылася своеасаблівым “пропускам” у краіну продкаў, а таксама выступала абярэгам ад злога духа.

У краінах Усходу чырвоны колер паўсюдна ўжываецца ў вясельнай абраднасці і ў нашы дні. Індыйская нявеста (акрамя хрысціянскіх штатаў) заўжды апранута ў чырвонае адзенне, на яе галаве чырвонае пакрывала. Варта адзначыць, што вясельны ўбор багата аздабляецца вышыўкай залатой ці жоўтай шаўковай ніткай, якая выступае сімвалам багацця і дабрабыту будучай сям'і. Аднак жоўты колер у індыйскай культуры мае і іншае значэнне. Гэта колер адказу ад зямнога дабрабыту, колер аскетызму, таму гэта колер манахаў-аскетаў.

У беларускай вышыўцы народных тканін чырвоныя ніткі спалучаліся з сінімі ці чорнымі. Чорны колер, які некаторыя навукоўцы трактуюць толькі як колер змроку, ночы, магілы, смерці і зла, ва ўяўленні нашых продкаў мог мець і некалькі іншае значэнне, бо ў архаічнай культуры смерць ніколі не ўспрымалася як канец, а толькі як перараджэнне (зярно – колас). Даследаванні паказалі, што сімволіка чорнай пражы ў шэрагу выпадкаў супрацьпастаўлялася чырвонай і ўспрымалася як адзнака жалобы, няшчасця і смутку. Ужыванне сініх баваўняных нітак у беларускай вышыўцы храналагічна папярэднічала чорным, бо сінюю фарбу было лягчэй знайсці. Семантыка сіняга колеру на рубяжы стагоддзяў была ідэнтычна чорнаму. Падобным чынам успрымалася ў шэрагу выпадкаў і адзенне сіняга колеру. Так, поясам сіняга колеру падпярэзвалі памерлага, у Смаленскай губерні ў сініх андараках хадзілі “па смутку”.

Актыўнае пранікненне чорнага колеру ў пахавальнае і жалобнае адзенне ва ўсходнеславянскіх народаў пачалося даволі позна, толькі ў Х1Х – пачатку ХХ ст. пад уплывам горада.

Аднак было б няправільна звязваць сіні (чорны) колер у беларускай народнай вышыўцы толькі з сімволікай жалобы і негатыўных з'яў. Вядома, што ў асобных раёнах Беларусі святочнае адзенне ўпрыгожвалася манахромнай вышыўкай чорнага колеру (Брэсцкі, Буда-Кашалёўскі раёны). А што датычыцца спалучэння чырвонага з сінім (чорным), то яно

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

здаўна разглядалася як адзін з кампанентаў, які ўзмацняў магічную функцыю вышыванага ці тканага арнаменту. Можна меркаваць, што спалучэнне ў старажытных вышыўках асноўнага чырвонага і дадатковага сіняга (чорнага) спрадвеку з’яўлялася сімвалам дуалізму дзвюх супрацьлеглых асноў: дабра і зла, жыцця і смерці. Найбольш класічнай формай такога каларыту з’яўляюцца вышыўкі Палесся.

Калі ў Беларусі чорны колер ужываўся даволі часта, то ў індыйскай культуры чорны колер больш шырока ў адзенні стаў выкарыстоўвацца з другой паловы XX ст. пад уплывам англійскіх каланізатараў, прычым чорны колер звычайна заглушаецца чырвоным ці малочна-белым. Такое стаўленне да чорнага колеру ў індыйскай культуры звязана з тым, што ён успрымаўся як сімвал зямной стыхіі, да якой адносілі ніжэйшыя касты, таму ён раней ніколі не ўжываўся ў адзенні прадстаўнікоў касты брахманаў і кшатрыяў (гэта не датычыцца мусульман).

Увогуле спалучэнне белага, чырвонага і чорнага колераў можна ўспрымаць як знакі трох узроўняў быцця, а магчыма, і як сімвалы нараджэння, жыцця і смерці чалавека, якія ўспрымаліся ў адзінстве. Такім чынам, ужыванне колеру перш за ўсё было звязана з міфалагічнымі ўяўленнямі нашых продкаў, якія ў пэўнай ступені дайшлі і да нашых дзён.

У цяперашні час неабходна навучыцца чытаць вышываныя і вытканыя на адзенні арнаменты, спалучэнні колераў, каб ведаць сваё мінулае, разумець сённяшні дзень і клікаць светлую будучыню, як гэта стагоддзямі рабілі нашы продкі.

---

1. *Багданава Г.Б.* Ручнікі Усходняга Палесся на мяжы спалучэння дахрысціянскіх і хрысціянскіх традыцый // Ручнік у прасторы і часе. – Мн., 2000.

2. *Маслова Г.С.* Народная одежда в восточнославянских традиционных обычаях и обрядах Х1Х – начала ХХ в. – М., 1984.

3. *Маслова Г.С.* Народная одежда русских, украинцев, белорусов в Х1Х – начале ХХ в. // Этнография восточных славян. – М., 1987.

4. *Миронова Л.Н.* Цветоведение. – Мн., 1984.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. *Фадзеева В.Я.* Беларуская народная вышыўка. – Мн., 1991.

*В.Л.Хмурчык*

## АДЛЮСТРАВАННЕ СЭНСУ ЖЫЦЦЯ Ў СТУДЭНЦКАЙ СУБКУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

Студэнцкая субкультура – мультыкультурны феномен. Разнастайнасць, поліфанічнасць, паралельнае існаванне розных напрамкаў характарызуюць рух субкультуры моладзі. У гэтай з'яве прысутнічае аб'яднанне дзвюх плыняў:

– нацыянальна-культурных традыцый этнасу, прадстаўнікамі якога з'яўляецца студэнцкая моладзь. Яны праяўляюцца ў ментальнасці, менталітэце, нацыянальным характары дастаткова статычныя ў часе;

– сацыяльных сувязей індывіда з членамі групоўкі і светам у цэлым. Яны маюць зменлівы і дынамічны характар. Гэта прасторава-часавая характарыстыка соцыуму моладзі.

Кожны прадстаўнік субкультуры студэнцтва мае свой, суб'ектыўны погляд на свет, свае думкі пра сэнс чалавечага існавання. Паводле меркавання Б.Р.Ананьева, вызначаны ўзрост сензітыўны для развіцця асноўных сацыягенных патэнцый чалавека. Адбываюцца павелічэнне памяркоўнасці ў дзейнасці, авалоданне лагічнымі аперацыямі, самастойная рэгуляцыя сваіх паводзін. У студэнцкі час ламаюцца ўсе дынамічныя стэрэатыпы. Знешнія фактары, якія развіваюць асобу, прыводзяць у рух і самарух унутраныя псіхалагічныя працэсы. Прафесіяналізуюцца (ускладняюцца і разгаліноўваюцца) псіхалагічныя станы, вопыт.

У працэсе зносін на ўзроўні суб'ект–суб'ект самасвядомасць студэнта, здольная да ўспрымання новай інфармацыі, пашыраецца. Гэтая з'ява садзейнічае далейшаму росту асобы маладога чалавека. Але сувязь на ўзроўні суб'ект–суб'ект адбываецца толькі пры даверлівым кантакце з выкладчыкам, блізкім чалавекам ці ў нефармальным гурце з равеснікамі. Замкнёнасць суб'екта на сувязі з якой-небудзь сацыяльнай групай накладвае адбітак на яго светапогляд. Ён становіцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ